Учреждение образования
«Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина»
Факультет иностранных языков

# АКТУАЛЬНЫЕ ВОПРОСЫ ГЕРМАНСКОЙ ФИЛОЛОГИИ И ЛИНГВОДИДАКТИКИ

Материалы XXVIII Международной
научно-практической конференции

Брест / Беларусь, 1 марта 2024 года

В 2 частях

Часть 1

Брест 2024

УДК 811.11+372.016:811.111’112.2(082)
ББК 81.2Англ+81.2Нем
А 43

*Рецензенты:*
**Т И. Свистун**, кандидат филологических наук, доцент
**Н. В. Иванюк,** кандидат педагогических наук, доцент
*Редакционная коллегия:*
**Е. Г. Сальникова**, кандидат филологических наук, доцент
**О. Л. Зозуля**, кандидат филологических наук, доцент
**И. В. Повх**, кандидат филологических наук, доцент
**Л. Я. Дмитрачкова**, кандидат педагогических наук, доцент

**Актуальные вопросы германской филологии и лингводидактики** : материалы XXVIII междунар. науч.-практ. конф., Брест, 1 марта 2024 г. : в 2 ч. / Брест. гос. ун-т имени А. С. Пушкина ; под общ. ред. Е. Г. Сальниковой. – Брест : БрГУ имени А. С. Пушкина, 2024. – Ч. 1. – 199 с.

В сборник вошли материалы XXVIII Международной научно-практической конференции, которая проходила 1 марта 2024 года на базе факультета иностранных языков учреждения образования «Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина».

Сборник включает материалы, в которых рассматриваются актуальные вопросы лингвистических и литературоведческих иследований, а также лингводидактические основы и инновационные направления языкового образования.

Сборник адресован научным сотрудникам, преподавателям учреждений высшего образования, аспирантам, студентам.

Ответственность за содержание и стиль публикуемых материалов несут авторы.

**М. У. ГУЛЬ**
Беларусь, Брэст, БрДУ імя А. С. Пушкіна

## ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ ЭКАЛІНГВІСТЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Ідэі аб каштоўнасці моў і аб неабходнасці захавання лінгвістычнай разнастайнасці бяруць пачатак з філасофска-лінгвістычнай канцэпцыі Вільгельма Гумбальта, які прапанаваў такі тэзіс: мова – дзейнасць чалавечага духу, адзіная энергія народа. Некаторыя навукоўцы вылучаюць тры стадыі ў развіцці экалогіі мовы: 1) мадэль "мова – жывы арганізм" (XIX ст.); 2) канцэпцыя Людвіга Вітгенштэйна "мова – форма жыцця" (сярэдзіна XX ст.); 3) перыяд, які пачаўся з прац Эйнара Хаўгена. Э. Хаўген лічыцца ініцыятарам сучасных экалінгвістычных даследаванняў і аўтарам тэрміна "language ecology" (экалогія мовы). Упершыню тэрмін "экалінгвістыка" сустракаецца ў рабоце псіхолага Курта Зальзінгера, які меў на ўвазе тое, што пры аналізе мовы павінна ўлічвацца асяроддзе, у якім яна ўжываецца. Другое згадванне тэрміна "экалінгвістыка" фіксуецца ў працы "Чалавек, які гаворыць" французскага навукоўца Клода Ажэжа. У XXI ст. узніклі такія напрамкі даследаванняў, як экакрытыка, экапаэтыка, экафемінізм, экапсіхалогія, экасацыялогія, экагісторыя, палітычная экалогія, інвайраментальная камунікацыя і інш.

Згодна з поглядамі Э. Хаўгена, моўная экалогія можа вызначацца як вывучэнне ўзаемадзеяння паміж нейкай мовай і яе асяроддзем. Пад асяроддзем разумеюцца не фізічныя ўмовы існавання мовы, а сацыяльныя і культурныя. Такім чынам, асяроддзе пэўнай мовы – тыя людзі, якія ёй карыстаюцца. Мова існуе толькі ў свядомасці моўцаў і функцыянуе толькі ў адносінах карыстальнікаў адзін да аднаго і да прыроды, гэта значыць да іх сацыяльнага і фізічнага асяроддзя [1, с. 57]. Экалогія асяроддзя мае два кампаненты: псіхалагічны і сацыялагічны. Псіхалагічны кампанент апісвае існаванне мовы ў свядомасці карыстальніка, як ён/яна выкарыстоўвае яе для разумення рэчаіснасці. Гэты аспект таксама ахоплівае ўзаемадзеянне гэтай мовы з іншымі мовамі, якімі валодае карыстальнік, і адносіны карыстальніка да яе. Сацыялагічны кампанент датычыцца функцыянавання мовы ў працэсе ўзаемадзеяння паміж людзьмі. Гэты кампанент уключае такія аспекты, як калі, дзе і чаму выкарыстоўваецца ці не выкарыстоўваецца мова і як гэта датычыцца сацыяльных паводзін карыстальніка. Такім чынам, экалогія мовы засяроджана на грамадскім і культурным узаемадзеянні.

На думку Э. Хаўгена, біялагічнае, інструментальнае і структурнае разуменні мовы з'яўляюцца метафарамі, але тым часам мовы маюць жыццё, мэту і форму. Мова павінна разглядацца ў першую чаргу як аспект паводзін чалавека. Паводзіны з'яўляюцца дуалістычным феноменам: гэта і тое, што скіравана вонкі – дзеянне, і тое, што мае ўнутраны патэнцыял – кампетэнцыя [1, с. 58]. Мовы вывучаюцца ў дзеянні, але зробленыя абагульненні датычаць кампетэнцыі.

Каб прааналізаваць мову з пункту гледжання экалогіі, трэба адказаць на наступныя пытанні: 1) Як класіфікаваць гэтую мову ў адносінах да іншых моў? 2) Хто яе карыстальнікі? 3) Якая сфера яе выкарыстання? 4) Якія іншыя мовы выкарыстоўваюць носьбіты/карыстальнікі дадзенай мовы? 5) Якія ўнутраныя разнавіднасці мае мова? 6) Якая прырода пісьмовых традыцый мовы? 7) У якой ступені пісьмовая форма мовы ўнармавана? 8) Якую інстытуцыйную падтрымку мае мова (урад, адукацыя, прыватныя арганізацыі)? 9) Як адносяцца карыстальнікі да мовы? [1, с. 65].

Ідэі Э. Хаўгена развіваліся ў 1980-я гг. яго паслядоўнікамі. Так, Вільхельм Трампе карыстаўся метафарай экасістэмы для тлумачэння таго, што выкарыстанне мовы цесна звязана з асяроддзем, г. зн. знешнім светам. Другі напрамак экалінгвістычных даследаванняў пачынаецца ў 1990 г., калі Майкл Халідэй на лекцыі ў Салоніках паставіў пытанне аб сувязях моўных структур і асаблівасцей тэкстаў пра экалагічныя праблемы. М. Халідэй лічыць, што мова адыгрывае вялікую ролю ва ўзмацненні праблем навакольнага асяроддзя. Граматыка і слоўнікавы склад фарміруюць вопыт чалавека і трансфармуюць успрыняцце ў значэнне. У сувязі з гэтым М. Халідэй прапанаваў змяніць спосабы абазначэння. Такім чынам з'явілася новае бачанне экалогіі мовы як чынніка магчымага вырашэння экалагічных праблем. У межах гэтага напрамку вылучаюцца два тыпы даследаванняў: крытыка тэкстаў на экалагічную тэматыку (экалагічнага дыскурсу) і крытыка моўнай сістэмы. У рэчышчы апошняга напрамку працаваў і М. Халідэй. На яго думку, вялікі ўплыў на свядомасць чытачоў маюць тыя лексічныя структуры, якія ўжываюцца ў тэкстах на экалагічную тэматыку. Так, спалучэнні *zero population growth* і *negative growth* маюць станоўчыя асацыяцыі, таму больш эфектыўна замест *growth* ужываць спалучэнне *failure to shrink* [2, с. 83]. Не менш значным з'яўляецца і ўплыў граматычных структур. Так, рэчыўныя назоўнікі маюць формы толькі адз. л. ці мн. л., іх нельга лічыць (*coal*, *gas*, *oil*). Гэта можа садзейнічаць фарміраванню ўяўлення пра тое, што прыродныя рэсурсы бясконцыя, невычарпальныя. З пункта гледжання граматыкі чалавек асацыіруецца з дзейнікам, агентам, з тым, хто дзейнічае, а прырода – з дапаўненнем, з тым, над чым адбываецца дзеянне, і гэта вядзе да эксплуататарскіх адносін да прыроды [2, с. 87].

Метафара экасістэмы выяўляецца вельмі прадуктыўнай. Экалогія мовы дапаўняецца экалогіяй культуры, якая разглядае, як прыродныя экасістэмы эвалюцыянавалі ў культурныя, прычым мова прызнаецца страчаным звяном паміж гэтымі дзвюма стадыямі развіцця. Акрамя таго, метафара экасістэмы выкарыстоўваецца (замест састарэлай метафары машыны ці камп'ютара) для разумення кагнітыўных працэсаў, якія адбываюцца ў свядомасці чалавека, і для працэсаў узаемадзеяння, якія раней тлумачыліся метафарай "адпраўнік – атрымальнік". Гэта метафара і канцэпцыя Э. Хатчынса паслужылі адпраўной кропкай для развіцця яшчэ аднаго новага экалінгвістычнага напрамку – кагнітыўнай экалогіі. У той час як класічная кагнітыўная навука тлумачыць, як індывіды маніпулююць сімваламі і як здараецца актывацыя апрацоўкі інфармацыі, тэорыя Э. Хатчынса цікавіцца больш шырокім колам пытанняў, і яны не абавязкова датычацца толькі аднаго індывіда. Э. Хатчынс вылучае тры тыпы размеркавання пазнання: кагнітыўныя працэсы могуць быць размеркаваны паміж членамі сацыяльнай групы; кагнітыўныя працэсы могуць быць размеркаваны ў тым сэнсе, што функцыянаванне кагнітыўнай сістэмы ўключае каардынацыю паміж унутранай і знешняй (матэрыяльнай) структурай; кагнітыўныя працэсы могуць быць размеркаваны ў часе ў тым сэнсе, што вынікі ранейшых падзей могуць змяняць сутнасць пазнейшых падзей [3].

Такім чынам, два сучасныя напрамкі ў экалінгвістычных даследаваннях узыходзяць да выказванняў Э. Хаўгена і М. Халідэя суадносна: экалогія разумеецца метафарычна (мова ў сваім асяроддзі); экалогія разумеецца ў біялагічным сэнсе; даследуецца роля мовы ў развіцці і абвастрэнні экалагічных і сацыяльных праблем; лінгвістычныя даследаванні ўяўляюцца як фактар у магчымым вырашэнні гэтых праблем. Трэці напрамак – кагнітыўная – экалогія, грунтуецца на поглядах Э. Хатчынса.

*Артыкул напісаны ў ходзе выканання НДР «Лінгвістычная бяспека ва ўмовах глабалізацыі: выклікі запазычвання з іншых моў (на прыкладзе сучаснай беларускай мовы)» у межах гранта Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў, нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20221040 ад 01.07.2022, навуковы кіраўнік – М. У. Гуль.*

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Haugen, E. The Ecology of Language / E. Haugen // Ecolinguistics Reader : Language, Ecology and Environment / ed. by A. Fill, P. Mühlhäusler. – London ; New York : Continuum, 2001. – P. 57–67.

2. Halliday, M. New Ways of Meaning: The Challenge to Applied Linguistics / M. Haliday // Thirty years of Linguistic Evolution: Studies in honour of René Dirven / ed. M. Pütz. – Philadelphia and Amsterdam : John Benjamins, 1990. – P. 59–95.

3. Hutchins, E. Distributed Cognition [Electronic resource] / E. Hutchins – Mode of access: https://arl.human.cornell.edu/linked%20docs/Hutchins_Distributed_Cognition.pdf. – Date of access: 19.01.2024.